У 1565 г. Жыгімонт Аўгуст па просьбе віленскага вальнага сейма ўстанавіў земскія сеймікі ў кожным павеце разам з абяцаннем ухвалення ў наступным годзе ІІ Статута ВКЛ. Таксама было аб'яўлена аб скліканні земскіх судоў у паветах. Гэта быў важны этап рэфармаванная судовай і адміністратыўнай сістэмы ВКЛ. На сеймікі павінны былі збірацца жыхары дадзенага павету, якія павінны былі абмяркоўваць праблемы ВКЛ, прадстаўленыя гаспадаром. Сеймікам было даручана абіраць паслоў, якія павінны былі адпраўляцца на вальны сейм у месца і тэрмін, вызначаны манархам. Трэба звярнуць увагу на той факт, што ўдзел у пасяджэннях сейміка быў не толькі прывілеем, але і абавязкам грамадзяніна.

У 1563 г. Жыгімонт Аўгуст выдаў прывілей аб ураўнанні ў правах праваслаўных з каталікамі. Таксама істотным было абяцанне ўвесці ў наступным годзе новы статут, які выкарыстоўваўся ў судовых справах у адносінах да ўсіх саслоўяў ВКЛ, і стварэнне ў кожным павеце земскіх і замкавых, ці гродскіх, судоў. Хутка пасля гэтага былі створаны і падкаморскія суды. Гэта азначала з прававога пункту гледжання ўраўнанне шляхты з "панамі" і князямі літоўска-рускімі, якіх да гэтага часу судзіў выключна гаспадарскі суд. Гэта таксама вызваляла шляхту ад часта суб'ектыўнага суда ураднікаў - ваявод, намеснікаў, старост, і параўноваўла іх у гэтых адносінах з каронай шляхтай.

Прававая рэформа і рэформа сеймікаў былі завяршэннем дзяржаўнай трансфармацыі ВКЛ, якая адбывалася ў 1560-х гг. XVI ст. Змены, уведзеныя Жыгімонтам Аўгустам у 1563–1566 гг., істотным спосабам паўплывалі на ВКЛ і на яго грамадства, а таксама наблізілі дзяржаўны лад ВКЛ да Кароны Польскай. Таксама яны істотна палегчылі прынясце Люблінскай уніі.

Каралю і вялікаму князю прыходзілася абапірацца на шляхту ў выпадку войнаў, а шляхта, у сваю чаргу, патрабавала новых прывілеяў за сваю службу. Войны ляжалі цяжкім бярэмям на драбнейшай шляхце, якая яшчэ больш бяднела з-за неабходнасці несці вайсковую службу. Гэта часткова тлумачыць, чаму сярэдняя і дробная шляхта на працягу XVII ст. страціла палітычную вагу на карысць магнатаў, але не пераставала змагацца за свае правы на працягу ўсяго існавання Рэчы Паспалітай. Для валодання шляхецтвам як у ВКЛ, так і ў Польшчы не абавязковым было валоданне зямлёй. Аднак шляхта падазрона сачыла за тым, каб права землеўладання заставалася толькі за шляхецкім саслоўем. У выпадку парушэння гэтага правіла справа даходзіла да суда як апошняй інстанцыі [2].

Кантроль шляхты над палітычным жыццём Рэчы Паспалітай меў своеасаблівую прыроду. Гэта не была тыповая алігархія з выпрацаваным падзелам улады, а зменлівая група "фамілій", якія канкурыравалі паміж сабой і змянялі адна адну на палітычнай арэне.

У сярэдзіне XVII–XVIII ст. улада ў Рэчы Паспалітай належала вельмі абмежаванаму колу эліты, якая трымала ў сваіх руках усе галоўныя дзяржаўныя пасады і дзякуючы гэтаму змагла сфарміраваць сваю сістэму кліентэль, заснаваную на ўзаемных паслугах. Адносіны "патрон – кліент" у гэтай сістэме засноўваліся на ідэі шляхецкага братэрства. Таму ў вачах шляхты быць кліентам не было ганебным; наадварот, гэта была прамая магчымасць удзельнічаць у прыняцці палітычных рашэнняў (на сеймах), а значыць, рэалізоўваць сваё саслоўнае, грамадскае і дзяржаўнае права.

Важным сродкам праяўлення палітычнай актыўнасці шляхты быў удзел у сеймах, куды шляхта накіроўвала сваіх дэпутатаў. Шляхта разглядала свой удзел у Радзе і Сенаце не як міласць з боку караля ці вялікага князя, а як сваё законнае права. Аднак гэтым удзел шляхты ў кіраванні дзяржавай не абмяжоўваўся. У канцы XVI – пачатку XVII ст. цяжар палітычнага жыцця пераносіцца з цэнтра ў паветы, дзе на мясцовых сейміках шляхта жыва вырашала пытанні, якія тычыліся агульнадзяржаўных спраў, і часам прымала рашэнні, якія супярэчылі пастановам цэнтральных органаў.

Роля мясцовых сеймікаў як голасу шляхецкага брацтва ў палітычным жыцці дзяржавы расла [7, с. 135]. Рашэнні сеймікаў адыгрывалі вызначальную ролю, напрыклад, у справе збору падаткаў. Нязгода дэпутатаў фактычна азначала іх нявыплату, з чым магнатам і вялікакняскай адміністрацыі

**Л.Я. Клімуць** (*г. Магілёў, РБ*)

## УЗАЕМААДНОСІНЫ МАГНАТАЎ І ШЛЯХТЫ Ў ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Магнаты і шляхта ВКЛ складалі адзінае саслоўе і юрыдычна лічыліся непадзельнай "палітычнай нацыяй". Аднак на самой справе ў палітычным жыцці гэтыя слаі грамадства не заўсёды выступалі з адзінага пункту гледжання. Адносіны паміж сярэдняй, дробнай шляхтай і магнатамі ў розныя перыяды складваліся па-рознаму, але палітычная сістэма ВКЛ і Рэчы Паспалітай у цэлым спрыяла рэгуляванню гэтых адносінаў. Мы засяродзім тут увагу перш за ўсё на палітычнай сістэме.

У Кароне Польскай і Вялікім Княстве Літоўскім не склалася абсалютысцкіх манархій, характэрных для шэрагу вядучых краін Еўропы. Вялікі князь, з'яўляючыся, у выніку персанальнай уніі, адначасова і каралём польскім, працяглы час знаходзіўся ў Кракаве і на перыяд адсутнасці мусіў дэлегаваць свае паўнамоцтвы магнацкаму органу – панам-радзе. У выніку апошнія ўмацаваліся настолькі, што без іх санкцыі манарх не мог прымаць важнейшыя рашэнні. У Польшчы падобнага магнацкага засілля не існавала, аднак улада караля абмяжоўвалася шырокімі правамі шляхты, якая выяўляла сваю волю на сеймах. Польская практыка аказалася вельмі спакуслівай для шляхты ВКЛ, і ў далейшым яна лягла ў аснову дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай.

Каралеўская палітыка спрыяла ўзмацненню шляхты ў эканамічным і палітычным сэнсе. Феадальны характар дзяржавы вымушаў манархаў павялічваць колькасць ваенна-служылага люду праз раздачу зямельнага фонду [5, с. 58].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прыходзілася лічыцца. У 1606 г. на сейміку ў Полацку шляхта не толькі не згадзілася з падаткамі, але і выказала папрок сваім паслам у невыкананні дадзеных ім інструкцый, што расцэньвалася як парушэнне іх свяшчэннага права на вырашэнне дзяржаўных спраў [6].

Гісторыкі ў адносінах да гэтых працэсаў выкарыстоўваюць тэрмін "дэцэнтралізацыя ўлады", таму што найважнейшыя рашэнні фактычна прымаліся на мясцовым узроўні. Сведчаннем дэцэнтралізацыі было тое, што канкрэтныя рашэнні па справах значна лягчэй прымаліся на мясцовых з'ездах шляхты, чым на Вальным сейме. Фактычна краіна складалася з асобных дзяржаў са сваімі арміямі і правіцелямі, якія валодалі на месцах значна большай уладай, чым кароль (Радзівілы ў ВКЛ, Патоцкія ў Польшчы) [8, с. 77].

З другога боку, нельга сцвярджаць, што магнаты ВКЛ не падлягалі своеасабліваму кантролю з боку сярэдняй і дробнай шляхты. І для гэтага былі легальныя магчымасці. Абапіраючыся на ідэю шляхецкай роўнасці, шляхта лічыла магчымым для сябе ўмяшацца ў канфлікты магнатаў дзеля заспакаення сітуацыі, як гэта адбылося на генеральным сейміку ў Слоніме ў 1600 г., калі дэлегаты прапанавалі мірным шляхам вырашыць канфлікт паміж Радзівіламі і Хадкевічамі.

Генеральныя сеймікі, называныя ў народзе таксама "генераламі", некаторы час былі моцным інструментам у руках сярэдняй і дробнай шляхты. На гэтых сейміках збіраліся паслы і сенатары адной правінцыі. Генеральныя сеймікі да сярэдзіны XVII ст. паступова прыйшлі ў заняпад, што было звязана з агульным узрастаннем значэння земскіх сеймікаў за кошт генеральных і вальнага сейма. Генеральныя сеймікі ў Літве ствараліся на ўзор каронных. На генеральным сейміку выпрацоўвалі агульнае стаўленне літоўскіх парламентарыяў (сенатараў і паслоў) у важных для краю справах (і ВКЛ, і РП увогуле). Яны параўноўвалі інструкцыі, выдадзеныя паслам у паветах, і затым выпрацоўвалі ўласную, агульналітоўскую палітычную праграму.

Нягледзячы на фармальна высокае становішча генеральнага сейміка (які выконваў таксама ў нейкай ступені ролю напаміну пра самастойнасць Літвы), гарантаванае III Статутам, ён не часта дасягаў вынікаў. Таксама наведванне на тых сейміках, якія адбыліся, часта пакідала жадаць лепшага. Пакуль быў жывы галоўны папулярызатар генеральных сеймікаў Леў Сапега, віленскі ваявода, а перш за ўсё канцлер, а затым вялікі гетман літоўскі, яны адбываліся досыць рэгулярна, аднак пасля 1632 г. ужо толькі спарадычна.

У 1600 г. адбыўся генеральны сеймік у Слоніме. Гэта быў перыяд гвалтоўных спрэчак паміж Радзівіламі і Хадкевічамі за руку Соф'і – спадкаемцы вымерлай мужчынскай лініі роду княжат Алелькавічаў Слуцкіх, якія належалі да роду Гедымінавічаў. Спрэчкі паміж гэтымі родамі пагражалі нават пачаткам грамадзянскай вайны. У гэтай сітуацыі ўдзельнікі сейміка ў Слоніме адчулі сябе абавязанымі паказаць удзельнікам спрэчкі неадпаведнасць іх паводзін і заклікаць іх да мірнага вырашэння спрэчкі. Быў адпраўлены ліст да Крыштофа Радзівіла [185]. Такі ж ліст павінен быў быць адасланы Хадкевічам, але ён не захаваўся.

Як відаць, усеўладдзе магнатаў на Літве ў дадзены перыяд не было такім поўным, як гэта лічаць некаторыя аўтары. Нават самыя магутныя маглі пачуць папрокі з вуснаў "малодшай браціі шляхецкай". Прызнаем, што пазней гэта было б значна цяжэй зрабіць.

Для шляхты ВКЛ увогуле былі характэрныя ваенныя канфлікты паміж сабой. Аднак для сярэдняй шляхты канфлікт звычайна заканчваўся афіцыйным прымірэннем і не ўплываў на дзяржаўныя справы. У той жа час канфлікт магнатаў нёс пагрозу дзяржаве, што яскрава гучыць у абвінавачванні іх у выкарыстанні "чужаземных людзей і чужых салдат" [185] у вышэй прыведзеным урыўку. Сярэдняя шляхта бачыла ў сабе захавальніка дзяржавы і імкнулася абмежаваць свавольства магнатаў.

На працягу XVII ст. улада пераходзіць да магнатаў на *месцах, а кароль становіцца ўсё больш залежнай* ад магнацкай вярхушкі фігурай. Нязгодныя з рашэннем сейма маглі выказаць свой пратэст шляхам утварэння канфедэрацыі. Шляхта мела права канфедэрацыі і ў тых выпадках, калі ўрад не выконваў свае абавязкі. Юрыдычная аснова канфедэрацый заключаецца ў канцэпцыі вярхоўнай улады шляхты [5, с. 65].

Шляхта была схільная падтрымаць ініцыятара канфедэрацыі супраць караля, таму што ў яе вачах ён з'яўляўся абаронцам традыцыйных шляхецкіх правоў. Аднак гэта не тычылася тых выпадкаў, калі гаворка ішла пра супрацоўніцтва з ворагам. Вельмі паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца ўспрыманне шляхтай прызнання Янушам і Багуславам Радзівіламі ўлады шведскага караля Карла Густава падчас т. зв. "Патопу" і заключэння ў 1655 г. Кейданскай уніі [4, с. 12–13].

Такім чынам, нягледзячы на тое, што на справе шляхта Рэчы Паспалітай падзялялася на некалькі слаёў з рознымі эканамічнымі і палітычнымі магчымасцямі, у палітычнай тэорыі пераважала ідэя шляхецкай роўнасці. Дзяржаўная сістэма Рэчы Паспалітай функцыянавала такім чынам, што любы слой "народу палітычнага" могуць быць пачуты на дзяржаўным узроўні. І хоць з цягам часу сітуацыя мянялася на карысць вярхоў шляхты, сярэдняя і дробная шляхта не праставала адстойваць свае правы на ўдзел у палітычным працэсе.

**Літаратура:**


1. Скарга зямяніна Адама Ейсіманта на зямяніна Балтрамея Ейсіманта і яго сыноў за валоданне "Ейсімантамі на Бурыеве", не маючы шляхецкага паходжання // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 1755. – Воп. 1. – Спр. 12. – Л. 370–372.
2. *Рахуба, А.* Палітычныя групоўкі ў ВКЛ / А. Рахуба // Спадчына. – 2002. – №№ 5–6. – С. 32–47.
3. *Augustyniak, U.* Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła: (1585–1640): mechanizmy patronatu / U. Augustyniak. – Warszawa: Wydaw. Naukowe "Semper", 2001. – 386 s.
4. List sejmiku generalnego w Słonimiu do Krzysztofa Radziwiłła "Pioruna", wojewody wileńskiego i hetmana wielkiego litewskiego, z 29.I. 1600 roku // Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD). – Archiwum Radziwiłłów (AR). – Dz. II. – Nr 411.
5. *Mączak, A.* Klientela: nieformalne systemy władzy w Polsce i Europie XVI–XVIII w. / A. Mączak. – Wyd. 2. – Warszawa: Semper, 2000. – 355 s.
6. Radziwiłłowie herbu Trąby / Sławomir Górzyński [et al.]; Naczelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. Archiwum Główne Akt Dawnych. – Warszawa: Wydawnictwo DiG, 1996. – 67 s.
7. *Tobiasz, M.* Szlachta i możnowładztwo w dawnej Polsce: szkic / M. Tobiasz. – Kraków: "Ex libris", ca 1946. – 194 s.
8. Uchwała połockiego sejmiku relacyjnego z 16.V.1606 roku sprzeciwiająca się podniesieniu podatków // Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD). – Archiwum Radziwiłłów (AR). – Dz. II. – Nr 450.
9. *Zakrzewski, A.* Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. – ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki / A. Zakrzewski. – Warszawa: Liber, 2000. – 257 s.
10. *Zajączkowski, A.* Główne elementy kultury szlacheckiej w Polsce: ideologia a struktury społeczne / A. Zajączkowski. – Wrocław [etc.]: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1961. – 118 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова